Анализом вооруженной борьбы с этносепаратизмом в Чечне занимался Р.С. Киреев. Данный исследователь рассматривает хронологию событий чеченского конфликта, вылившегося в две чеченские войны, дает его характеристику. Приводятся мнения других ученых по вопросам проводимой политики в изучаемом регионе. Данный исследователь делает вывод о несовершенстве правовой основы национальной политики и отсутствии взвешенных решений в действиях наших политиков. Однако ученый не отрицает положительных мер, предпринятых при Президенте РФ В.В. Путине, и надеется на то, что подобный конфликт не повторится в будущем [7].

**Заключение.** Таким образом, за последние десятилетия историография по проблеме сепаратизма в Чечне обогатилась новыми мнениями, изложенными как в крупных трудах, так и статьях, опубликованных в научных журналах. Политологи и историки смогли дать науке довольно обширный комплекс мнений по данной проблематике, сопоставление и анализ которых поможет предотвратить подобные конфликты в будущем.


1. Матвеев, В.А. Российская универсалистская трансформация и сепаратизм на Северном Кавказе (вторая половина XIX – 1917 г.) / В.А. Матвеев. – Ростов-на-Дону: ООО «Омега Паблишер», 2012. – 560 с.
2. Заурбекова, Г.В. Сепаратизм в Чечне / Г.В. Заурбекова. – М.: ИЭА, 2000. – 41 с.
3. Цветкова, В.Ф. К вопросу о предпосылках «чеченского конфликта» / В.Ф. Цветкова // Вестник Санкт-Петербургского университета. – 2006. – Выпуск 4. – С. 182–185.
4. Цветкова, В.Ф. Политическая ситуация и социально-экономические предпосылки чеченского конфликта в начале 90-х гг. XX в. / В.Ф. Цветкова // Общество. Среда. Развитие (Terra Humana). – 2008. – №4. – С. 33–45.
5. Ахметов, А.А. Кризис легитимности власти как ключевой фактор актуализации сепаратизма в России в 90-е гг. XX в. / А.А. Ахметов // Вестник МГОУ. – 2010. – №3. – С. 137–141.
6. Ахметов, А.А. Сепаратизм на постсоветском пространстве / А.А. Ахметов. – М.: Издательство МГОУ, 2010. – 134 с.
7. Киреев, Р.С. Аспекты вооруженной борьбы с этносепаратизмом в Чеченской республике / Р.С. Киреев // Власть. – 2007. – №5. – С. 23–27.


## РЭАКЦЫЯ ЎЛАД НА СУПРАЦІЎЛЕННЕ ПЕРАВОДУ З КАТАЛІЦЫЗМУ Ў ПРАВАСЛАЎЕ Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.


***Кароль М.М.***

*магістр гістарычных навук БДУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Касцюк М.П., акадэмік НАН Беларусі, доктар гіст. навук, прафесар*


У другой палове XIX ст., асабліва пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг., расійскія ўлады ажыццяўлялі на тэрыторыі беларускіх губерняў прымусовы перавод насельніцтва (пераважна сялянскага) у праваслаўе. У большасці выпадкаў такая палітыка выклікала супраціўленне тых, на каго яна была накіравана. Дадзенае пытанне, нягледзячы на працяглую гісторыю вывучэння, недастаткова распрацавана ў гістарыяграфіі – як айчыннай, так і замежнай. У шэрагу наяўных прац яно разглядаецца фрагментарна, на абмежаваным коле крыніц або падаецца тэндэнцыйна.

Мэта працы – ахарактарызаваць рэакцыю ўлад на выпадкі супраціўлення пераводу з каталіцызму ў праваслаўе.

**Матэрыял і метады.** Падчас правядзення даследавання выкарыстаны матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску, многія з якіх упершыню ўводзяцца ў навуковы зварот. У працы ўжыты гісторыка-генетычны і гісторыка-тыпалагічны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Рэакцыя расійскай адміністрацыі на супраціўленне далучаных да праваслаўя, якія не жадалі выконваць абрады, магла выяўляцца ў розных формах. Часцей за усё, за асобамі, якія адмаўляліся выконваць абрады праваслаўнай веры, усталёўваўся нагляд святара, які павінен быў пераконваць іх у неабходнасці прымаць праваслаўную абраднасць. Але здараліся выпадкі і больш суровага пакарання за жаданне захаваць сваю рэлігійную ідэнтычнасць.

Часам нязгодных выконваць абрады праваслаўнай царквы падвяргалі выдаленню з месца жыхарства, высылцы ў манастыр або ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі. Адзін з яскравых прыкладаў такога абыходжання – гэта лёс дваранкі Лізаветы Фадзеевай. З-за нежадання прыняць праваслаўную веру ў 1863 г. яна была саслана ў Варварынскі жаночы манастыр, дзе знаходзілася больш за 10 год, і была вызвалена толькі ў 1874 г. Тады было вырашана, што з прычыны таго, што Л. Фадзеева стала трымалася каталіцкай веры, то ёй дазваляецца вярнуцца на месца жыхарства з усталяваннем паліцэйскага нагляду за ёй [1, арк. 2].

Ссылкай ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі маглі быць пакараны найбольш актыўныя прадстаўнікі грамады, якая выказвала нежаданне прымаць праваслаўе ці заставацца ў



Репозиторий ВГУ

ім. У Тонава-Слабодскім прыходзе Мінскага павета Мінскай губерні падчас правядзення следства па прашэнні сялян аб дазволе ім вызнаваць рыма-каталіцызм былі выяўлены найбольш актыўныя сяляне, у якія былі залічаны жыхары вёскі Хатава Антон Багданкевіч, вёскі Жыдавічы Антон Чарняўскі і вёскі Лапаравічы Міхаіл Казак. Апошні з іх неаднаразова падаваў прашэнні на імя губернатара аб дазволе вярнуцца ў каталіцызм. У выніку А. Чарняўскі і А. Багданкевіч былі сасланы ў Валагодскую губерню пад нагляд паліцыі. Што датычыцца М. Казака, то яму было абвешчана, што калі ён працягне надалей падобную дзейнасць, то таксама будзе высланы [2, арк. 76–76 адв.].

Ваенны начальнік Себежскага павета Віцебскай губерні ў 1864 г. рапартаваў віцебскаму ваеннаму губернатару У.М. Вяроўкіну аб тым, што святар Дзядзінскай царквы паведаміў яму аб тым, што мяшчанка Усціння Аляксандрава, якая жыла ў вёсцы Грошава, з'яўляючыся праваслаўнай, спакушала ў каталіцызм жыхароў суседніх вёсак [3, арк.1]. Сама Усціння сведчыла, што яна насамрэч спявала некаторыя малітвы па-польску, але на момант следства цалкам адмовілася ад гэтага. Удава з вёскі Грошава Варвара і дзеўка Праскоўя далі паказанні, што Усціння Аляксандрава сапраўды вучыла іх па-польску, на пытанне ці ведаюць яны малітвы па-руску, адказалі, што не, бо іх ніхто ніколі не вучыў – не было каму, іх бацькі былі ўніятамі, а амаль усе моляцца па-польску [3, арк.1 адв.].

Па дадзеных святара Асынскай царквы, дваравая сялянка Юзэфа Сцяпанава адмаўлялася вызнаваць праваслаўе, пры гэтым, яна ўжо аднойчы прымала праваслаўе і яе бацькі былі праваслаўнымі. У прысутнасці прадстаўнікоў улады яна паўторна заявіла аб сваім нежаданні вяртацца ў праваслаўе. У выніку было вырашана падвергнуць Ю. Сцяпанаву суроваму манастырскаму пакаранню або высылцы ў аддаленыя месцы Расійскай імперыі для прыкладу іншым [3, арк.1 адв.].

Законы Расійскай імперыі, канкрэтна нормы, прапісаныя ва «Улажэнні аб пакараннях» і «Устаў аб папярэджанні і стрыманні злачынстваў», прадугледжвалі пэўны парадак дзеянняў для абароны ад «спакушэння» з пануючай веры, г. зн. праваслаўя, непаўнагадовых дзяцей.

У адпаведнасці з артыкулам 54 «Устава» Міністэрства ўнутраных спраў збірала дадзеныя пра сем'і, дзе былі людзі, якія адмаўляліся вызнаваць праваслаўную веру [4, с. 17]. І ў выпадку, калі ў такой сям'і былі непаўнагодовыя, маглі быць ужытыя меры па затрыманні іх у праваслаўі. Яны прызначаліся паводле меркавання імператара.

Такія дзеянні прапісваліся ўскосна і ў артыкуле 188 «Улажэння», які прадугледжваў, што ў выпадку адыходу ад праваслаўя ў іншае хрысціянскае веравызнанне, пры наяўнасці непаўнагадовых дзяцей, да вяртання ў праваслаўе для абароны дзяцей ад «спакушэння» ўрадам могуць прымацца «законныя меры» [5, с. 59]. На практыцы размытая фармулёўка пра «законныя меры» магла прымаць форму пагрозы адабраць дзяцей і перадаць іх на выхаванне праваслаўным сем'ям.

У 1876 г. істотная частка сялян Тонава-Слабодскай воласці Мінскага павета звярнулася даміравога пасрэдніка з прашэннем, што яны прынялі праваслаўе не добраахвотна і назаўжды застануцца каталікамі і «сілаю іх не зробяць праваслаўнымі», а з прычыны таго, што ксёндз іх да сябе не прымае, то дзеці іх застануцца без хросту, а нябожчыкаў яны пахаваюць без духавенства [6, арк. 32]. Тамтэйшыя сяляне не баяліся скардзіцца міравому пасрэдніку, нягледзячы на тое, што той папярэджваў іх, што ў іх могуць адабраць дзяцей і перадаць на выхаванне ў праваслаўныя сем'і [6, арк. 32 адв.].

У 1874 г. Мінскай палатай крымінальнага і грамадзянскага суда разглядаліся справы сялян Мінскага павета, якія былі абвінавачаныя ў «спакушэнні з праваслаўя ў каталіцызм». У адпаведнасці з рашэннем суда сяляне Сцяпан Жылін з жонкай Марыяй, Ігнацій Лапуцкі з жонкай Ганнай, Феліцыян Трасцянка з жонкай Марыяй і Ігнат Шыдлоўскі з жонкай Вікторыяй, якія заключылі шлюбы па праваслаўным абрадзе, за хрышчэнне і выхаванне дзяцей у рыма-каталіцкай традыцыі, былі заключаны ў турму тэрмінам на адзін год. Іх дзеці на гэты час былі перададзеныя на выхаванне сваякам праваслаўнага веравызнання [7, арк. 1 адв.].

**Заключэнне.** Такім чынам, у выпадку нязгоды выконваць абрады ў адпаведнасці з правіламі праваслаўнай царквы, улады Расійскай імперыі маглі ўжываць у дачыненні да нязгодных разнастайныя формы пакарання – ссылку, паліцэйскі або пастырскі нагляд, адабранне дзяцей і перадачу іх на выхаванне праваслаўным сем'ям, турэмнае зняволенне, штрафы.

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (НГАБ). – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2561. – Дело о разрешении Фадеевой исповедовать римско-католическую веру. 16.08.1874–22.01.1875.

Рэпазіторый БДУ

2. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2798. – Дело по прошению крестьня деревни Лопаревич Минского уезда о разрешении перейти из православной веры в римско-католическую. 24.06.1874–06.01.1875.
3. НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 31964. – Дело о переходе из православия в католицизм Александровой и Степановой. 28.04–06.06.1864.
4. Устав духовных консисторий – Санкт-Петербург : Синодальная типография, 1857 . – [4], 134, 56 с.
5. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных (изд. 1866 г.). – Москва : Тип. Шюман и Глушкова, 1867. - [2], 623, VIII, 21 с.
6. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2801. – Дело о разрешении крестьянам деревни Хотово Минского уезда исповедовать римско-католическую веру. 17.10.1875–27.09.1876.
7. НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 2557. – Дело об освобождении из-под стражи крестьян Першайской волости Минского уезда, обвиняемых в переходе в римско-католическую веру. 12–16.03.1874.

# РАЗВИТИЕ ВЕТЕРИНАРНОГО ОБРАЗОВАНИЯ В БЕЛАРУСИ В ПЕРВЫЕ ГОДЫ СОВЕТСКОЙ ВЛАСТИ

***Картунова И.И.***
*ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Орлова А.П., доктор пед. наук, профессор*

Вхождение в мировое образовательное пространство является стратегической целью современной системы образования. В связи с тенденциями республиканского и общемирового значения модернизации профессионального образования возрастает потребность в системном историко-педагогическом анализе становления и развития ветеринарного образования.

Цель исследования – выявление основных тенденций развития системы ветеринарного образования в Беларуси в первые годы советской власти.

**Материал и методы.** Источниковедческой базой послужили материалы Национального архива Беларуси: дело «Протоколы с № 1-31 заседаний коллегий Наркомзема БССР», дело «Сведения о культурно-просветительной работе ветеринарных органов БССР», исследования ученых, работающих в данной области. Работа выполнена с использованием комплекса методов, реализуемых в историко-педагогических исследованиях, в том числе: анализа и обобщения архивных материалов, литературных источников, изучения и обобщения передового педагогического опыта, беседы.

**Результаты и их обсуждение.** Развитие ветеринарного образования в Беларуси в первые годы советской власти было детерминировано широким распространением эпизоотий, малочисленностью ветеринарного персонала, недостаточным качеством его подготовки и возникновением необходимости расширения сети ветеринарных учреждений.

Успех борьбы с болезнями животных зависит не только от опыта ветеринарного персонала, но и от приобщения к данной деятельности широких слоев населения, среди которых с 20-х годов XX века стала проводиться разъяснительная работа о сущности, профилактике и методах борьбы с заболеваниями животных. Большую роль в распространении ветеринарных знаний сыграл Витебский ветеринарно-зоологический музей, открытие которого состоялось в 1918 году. В 1920 году в Витебске начал функционировать первый в Беларуси дом ветеринарного просвещения им. И.М. Садовского. Здесь же в 1922 году на базе губернской ветеринарной лаборатории был создан Белорусский государственный ветеринарно-бактериологический институт, в то время являвшийся центром ветеринарной науки в Беларуси [1].

Толчком к развитию ветеринарного образования послужило формирование законодательных норм и разработка Ветеринарного устава Беларуси, который был утвержден 14 июля 1924 года.

Большое значение для организации ветеринарного образования имело принятие 23 июня 1920 года постановления Совета Труда и Обороны «Об ускоренном выпуске ветеринарных врачей» [4].

Издание в 1921 году декрета СНК «О массовом распространении среди крестьянского населения сельскохозяйственных знаний и улучшении приемов ведения сельского хозяйства» стало основанием для создания краткосрочных курсов по ветеринарии и животноводству, продолжительность которых составляла от одного до трех месяцев.

В связи с нехваткой специалистов и необходимостью подготовки кадров проводилась большая организационная работа по открытию новых ветеринарных учебных заведений. Одним из первых документов советского правительства по ветеринарии было постановление Совнаркома РСФСР о создании в 1921 г. сельскохозяйственного техникума в Витебске, на базе которого в 1924 году был основан Витебский ветеринарный институт (ВВИ) с четырехлетним

Репозиторий ВГУ